## Літаратура

1. *Калеснік, У. А.* Максім Танк : нарыс жыцця і творчасці / А. У. Калеснік. – Мінск : Маст. літ., 1981. – 189 с.
2. *Колас, Я.* Збор твораў : у 20 т. / Я. Колас. – Мінск : Беларус. навука, 2009. – Т. 8. – 374 с.
3. *Танк, М. Збор твораў : у 13 т. / М. Танк. – Мінск : Беларус. навука, 2006–2012.*


*Г. А. Лукашэвіч (Беларусь)*

# ФІЛАСОФСКАЯ КАНЦЭПЦЫЯ Ў ТВОРЧАСЦІ МАКСІМА ТАНКА

Максім Танк – яскравы прадстаўнік разнастайных жанраў у літаратурнай плыні ХХ стагоддзя. Стыль яго паэзіі разнапланавы, рухомы. Пісьменнік спрабуе сябе ў новых фарматах і жанрах, дапаўняючы творы новымі рысамі. На пачатку дарогі ён прытрымліваўся рысаў рэалістычнага пісьма, быў прыхільнікам грамадзянскай паэзіі. Адсюль яго імкненне паказаць падзеі, факты такімі, якімі яны былі ў сапраўднасці. Зрок яго спыняўся на апісанні кожнай драбніцы побыту, аднаўленні ўсіх прыкметаў штодзённага жыцця, прыроды. Невыпадкова ж ён сам пісаў, што паэзія яго падобная на камень, вырваны з маставой падчас вулічных дэманстрацый. Нататкі аб сваёй творчасці Максім Танк беражліва захоўвае ў «Лістках календара» – дзённікавых запісах. Як адзначаў сам Максім Танк, ««Лісткі календара» – гэта фрагменты маіх дзённікаў, якія пісаў я да 1939 года, да часу ўз'яднання Беларусі». Менавіта тут мы, чытачы, нашчадкі літаратурнай спадчыны пісьменніка, можам знайсці адказы на пытанні аб творчасці аўтара. Можам адчуць тое, што натхняла класіка на стварэнне яго буйной літаратурнай спадчыны. Эмацыянальны падтэкст, нявыдуманасць фактаў, вернасць праўдзе абставінаў, пераплеценых з элементамі фантазіі з'яўляецца для творчасці Максіма Танка традыцыйнай: *«Лісткі майго календара ўвесь час перагортвае і шматае навальнічны вецер. Некаторыя з іх я сам вырываю і нішчу. Цяжка па такім календары жыць, яшчэ цяжэй будзе некалі аднавіць мінулае, а па ініцыялах і клічках – уваскрасіць сапраўдныя імёны многіх маіх сяброў»* [1, с. 3].

Філасофская канцэпцыя, рэалістычны светапогляд, асэнсаванне працэсаў, што адбываюцца ў рэчаіснасці – штуршкі натхнення Максіма Танка. Гэта і ёсць адчуванне тых змен, таго ўнутранага сталення, якія адбываліся з самім пісьменнікам. Праблема «простага людскога шчасця» заўсёды хвалявала людзей розных нацый, розных эпох і ўзростаў, не абмінула гэтая тэма і Максіма Танка. Яскравым прыкладам сведчыць верш М. Танка «Шчасце» *«Простае шчасце людское, / Так, як і наша з табою, Пэўна, складаецца з солі, / З хлеба, сабранага ў полі, / З поту, з дарожнага пылу, / З роднага небасхілу, / З дружбы, мацнейшай*

*ад смерці, / З песні... І так мне здаецца: / Каб з чаго іншага скласці, / Дык ці было б яно шчасцем?».*

Праз усведамленне лірычным героем шчасця Максім Танк у аднайменным вершы сцвярджае простую і вечную ісціну: шчасце – гэта само жыццё, бо ўсё пералічанае паэтам – выявы жыцця. Верш насычаны аднароднымі дапаўненнямі *(«з солі, з хлеба, з поту, з дарожнага пылу, з роднага небасхілу, з дружбы, з песні»),* пасля якіх – шматкроп'е: кожны можа працягнуць гэты пералік жаданымі для сябе выявамі жыцця, але ёсць і ўсведамленне таго, што «простае шчасце людское» аб'ядноўвае нас усіх. Усведамленне жыцця самога па сабе ва ўсіх яго праяўленнях, як шчасця – сведчанне мудрасці, аптымізму і жыццястойкасці чалавека наогул і лірычнага героя Максіма Танка ў прыватнасці.

Безумоўна, пісьменнік «шыфруе» зварот да чытача, выкарыстоўваючы пэўныя сімвалы. Так, напрыклад, хлеб і соль здаўна з'яўляюцца сімваламі дабрабыту, багацця, узаемаразумення. Пот разглядаецца як сімвал сумленнай і адданай працы як на зямлі, так і ў прафесійнай сферы дзейнасці. Дарожны пыл, можна меркаваць, носіць падтэкст руху, няспыннасці жыцця. Родны небасхіл, зразумела, што гэта – Радзіма, родны край.

Максім Танк у вершы «Шчасце» пакідае чытачоў з пытаннем наконт шчасця. Адказ кожны фармулюе асабіста. Зразумела, што паэт заклікае задумацца наконт сэнсу жыцця, запрашае ўсвядоміць, у чым заключана яго сутнасць.

Творчае жыццё Максіма Танка ўвасабляе агромністы свет трывожных роздумаў і асабістых глыбокіх перажыванняў, аб'ектыўных зрухаў у грамадстве, пераломных падзей і набалелых праблем, што вызначаюць лёс беларускага народа. Максім Танк, побач з Янкам Купалам, Якубам Коласам, Максімам Багдановічам, у найлепшых узорах сваёй творчасці здолеў узняць беларускую паэзію на сусветны ўзровень, а таксама стварыць унікальную філасофскую мадэль.

У канцы 50-х і наступныя гады паэзія Танка становіцца іншай у параўнанні з ранейшай. Яна ўсё больш і больш арыентуецца на адлюстраванне вечных тэмаў чалавечага існавання, напаўняецца глыбокім зместам, ускладняецца. У адпаведнасці з такой творчай устаноўкай і змяняецца стыль. Па-першае, з'яўляецца асацыятыўная вобразнасць і паводле яе – прытчападобнасць. Мастак суадносіць канкрэтнае і агульнае. Вызначальным сваёй канкрэтнасцю з'яўляецца верш *«Голас»: «Голас незнаемага можа здзівіць, / Голас друга – на хвіліну спыніць, / Голас любай – сагрэць сонцам лета, / Голас маці – вярнуць з таго свету».*

Невялікі па памеры, але моцны сваёй канкрэтнасцю, верш не губляецца на фоне жанравай канцэпцыі Максіма Танка. Выразна прасочваецца галоўны лейтматыў пісьменніка – гуманістычная ідэя, чарадзейнасць любві і ўсемагутнасць чалавека. Выкарыстоўваючы прыём градацыі, Максім Танк засяроджвае ўвагу на значнасці «галасоў» у жыцці чалавека. Незнаёмы не захапляе нашай увагі. Ён толькі сустрэчная фігура ў жыцці. Сябар можа спыніць нас і папярэдзіць аб учынках, якія могуць стаць фатальнымі. Каханне саграве душу, дае штуршок для натхнення і абуджае думкі. Толькі голас маці валодае ўсемагутнасцю. Калі дзіця ў небяспецы, маці зробіць усё магчымае,

каб яго выратаваць. Яе голас можа прымусіць жыць і змагацца, калі губляецца сэнс жыцця і душа пачынае стыць.

Максім Танк – складальнік яркага, філасофскага светабачання і светавыяўлення. Для гэтага паэта характэрна ўнутраная зацікаўленасць лёсам чалавека, агульная інтэлектуальная эрудыцыя, магчымасць «гуляць» з тропамі і мастацкімі сродкамі. Паэт дае магчымасць чытачу паразважаць над жыццём, над яго сэнсам, вызначыць прыярытэты і паставіць на п'едэстал тое важнае, што стане вызначальным для чалавека.

Максім Танк – творца, які не спыняецца на адным жанры, а знаходзіцца ў вечных пошуках свайго літаратурнага крэда. Ён узбагачае літаратурнае слова, дапамагае чытачу знайсці свой сэнс жыцця, падштурхоўваючы да здзяснення.

Паэзія Максіма Танка насычана агульначалавечым роздумам. Яе філасофская канцэпцыя, прасякнутая стваральнай ідэяй, гуманнасцю, любоўю да роднай зямлі, сведчыць пра сучаснасць танкаўскай творчасці ў яе найлепшых узорах, яе далучанасць да сусветных культурных традыцый. Вершы, паэмы, пераклады Максіма Танка сталіся важным укладам у скарбонку беларускай паэзіі.

Такім чынам, пра што б ні пісаў Максім Танк, ён ніколі не застаецца адным толькі назіральнікам у адносінах да падзей ці з'яў рэчаіснасці. Наадварот, ён заўсёды падае ўсё ад сэрца і праз сэрца. А гэта надае творам паэта характар шчырай спавядальнасці. Невыпадкова чытач з першых радкоў пачынае максімальна давяраць аўтару, суперажываць прачытанаму, сачыць за ходам думкі мастака слова.

## Літаратура


1. *Танк, М.* Збор твораў : у 13 т. / М. Танк. – Мінск : Беларус. навука, 2006–2012.



*Лю Цзын (Кітай)*


# ТЕОРИЯ И МЕТОДИКА ОБУЧЕНИЯ КИТАЙСКОМУ ЯЗЫКУ КАК ИНОСТРАННОМУ

В современных условиях развития мировой экономики специалисты должны обладать рядом профессиональных компетенций и личностных качеств, навыков и умений, которые позволят им быть успешными сотрудниками бизнес-компаний на международном рынке. Постоянное совершенствование технологий и систем управления предъявляет к образовательному процессу всё более высокие требования.

Китай – это одна из древнейших цивилизаций, которая насчитывает более 5000 лет. На протяжении истории большинство окружающих стран и национальностей изучало и использовало китайский язык, чтобы узнавать более развитую